Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
Кафедра беларускай і рускай моў

А. А. Носік

# ПАРЭМІЯЛАГІЧНЫЯ АДЗІНКІ Ў ПРАКТЫЦЫ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў МЕДЫЦЫНСКІХ ВНУ

Мінск 2026

У цяперашні час – век інтэграцыі, глабалізацыі, бесперапыннага развіцця высокіх інфармацыйных тэхналогій – гуманітарная сфера беларускамоўнай адукацыйнай прасторы знаходзіцца ў пошуку новых светапоглядных арыенціраў, імкнучыся адначасова да захавання традыцыйных ідэалаў і каштоўнасцей.

Навучанне беларускай мове як вучэбнай дысцыпліне кампанента ўстановы вышэйшай медыцынскай адукацыі скіравана на першачарговую рэалізацыю адукацыйных задач ў цеснай сувязі з рэалізацыяй выхаваўчых. Акрамя пашырэння і ўзбагачэння прафесійнага лексічнага запасу, выпрацоўкі ўмення практычнага карыстання тэрміналогіяй і прафесійнай лексікай па спецыяльнасці, студэнт павінен ўсведамляць пераемнасць і цесную сувязь беларускай мовы з культурай краіны, яе гісторыяй, фальклорам, менталітэтам.

Беларускі народ на працягу ўсёй сваёй гісторыі выяўляў схільнасць да красамоўства, да ажыўлення мовы, да дасціпнага і трапнага выражэння думак у малых мастацкіх формах. Глыбокім сэнсам, змястоўнасцю і велізарным выхаваўча-асветніцкім патэнцыялам валодаюць беларускія парэміі. Прыказкі і прымаўкі з’яўляюцца “захавальнікамі і выразнікамі шматвяковага гаспадарчага і жыццёвага вопыту народа, яго назіранняў і ведаў аб прыродзе, яго філасофіі і маралі, педагагічных поглядаў і правіл паводзін, ацэнкі гістарычных падзей, зборам практычных парад і рэкамендацый” [1, с. 5].

*Прыказкай* называецца створанае народам лаканічнае, часцей за ўсё вобразнае, устойлівае выслоўе з павучальным зместам, якое мае прамы і пераносны сэнс. *Прымаўка* характарызуецца незавершанасцю думкі; яна не мае такога абагульняльнага значэння і выкарыстоўваецца толькі ў канкрэтных выпадках, каб адцяніць, напрыклад, пэўную рысу чалавека, яго ўчынак, раскрыць сутнасць грамадскай або прыроднай з’явы. Сэнс прымаўкі можна зразумець толькі ў кантэксце [2, с. 391]. У дачыненні да методыкі выкладання беларускай мовы вывучэнне парэміялагічных адзінак з’яўляецца абавязковым для фарміравання ў студэнтаў лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі як складовай часткі камунікатыўнай кампетэнцыі.

Ужыванне парэміялагічных адзінак у працэсе вывучэння беларускай мовы мэтазгодна ўжо з першых тэм, якія закранаюць саму сутнасць мовы і раскрываюць асаблівасці яе функцыянавання ў соцыуме: *Рана загоіцца, а злое слова ніколі; Як брыдкае слова казаць, лепш язык выплюнуць; Добрае чуваць далёка, а благое яшчэ далей.*

Прыказкі вучаць любіць свой край, Радзіму, яе герояў. Народная мудрасць заклікае да паважлівых адносіна да сваіх родных мясцін, да еднасці з прыродай,

фарміруе паняцце патрыятызму: *Бацькаўшчыны не купляюць і не прадаюць; Ідзі ў родны край – там і пад елкаю рай; Дома і салома ядома, на чужыне і гарачы тук стыне; У роднай старонацы птушачкі пяюць, а ў чужой старонацы часта слёзы льюць; Чужая старана пірагамі не накорміць.* На падставе прыказак часта можна заўважыць цесную сувязь нашых продкаў з зямлёй, прасачыць розныя назіранні беларусаў за прыродай, уяўленні пра сувязь прысвяткаў і клімату, уплыў прыроды на чалавечае жыццё: *Май халодны – не будзеш галодны; Калі суніца чырванее, не сей проса — не паспее; Сей ячмень, як загудзіць сляпень; Зіма снежная — лета дажджлівае; Шмат снегу — шмат хлеба, Бяроза распускаецца – сей авёс, сады цвітуць – бульбу, каліна цвіце – грэчку; Калі год сухі – купляй пчолку, а калі мокры – купляй кароўку*. Адлюстраваная тэматыка спрыяе фарміраванню паважлівых адносін да наваколля, прыроды, традыцый.

Для беларускага менталітэту заўсёды актуальнай з’яўлялася апазіцыя “працавітасць – гультайства”. Працавіты чалавек лічыўся ўзорам, своеасаблівым жыццёвым ідэалам і гарантам дабрабыту. Відавочна, што гультайства, лянота, лайдацтва рэпрэзентаваліся як заганы чалавечага характару, якія ў прыказках набывалі часам гіпертрафіраванае, нават фатальнае значэнне: *Без працы не будзе шчасця; Хто ўлетку спіць, той узімку не есць; З музыкі хлеб невялікі, а з гулякі ніякі; Не ўмеў шанаваць –ідзі жабраваць; Сон на заўтра адкладзі, а справу сёння зрабі; Сей горы і даліны – не будзеш мець няшчаснае гадзіны; Той першы мэты дасягае, хто ўлетку сані папраўляе; Трэба ўлетку назбіраць, каб узімку было што жаваць.* Выкарыстанне такога тыпу прыказак у навучальным працэсе закладвае асновы арганізацыі ўласнага працоўнага дня і нагадвае аб важнасці працы ў дасягненні пастаўленых мэт.

Блізкім павучальным зместам валодаюць прыказкі, у якіх актуалізуюцца пытанні навучання, адукацыі, розуму: *Ад навукі дужэюць; Навука вочы адчыняе; Не навучыцца, пакуль не намучыцца; Пры пустой галаве і смех пусты; Розум не сякера – не пазычыш; Прыгожы той, хто разумны.*

Асаблівую цікавасць для будучых медыкаў уяўляюць прыказкі, аб’яднаныя тэматыкай здароўя, хваробы, харчавання: *Калі возьме за векі, не падмогуць і лекі; Калі мужык здароў, у яго сем паноў; Ліхаманка – не родная цётка; Мёд на стале – здароўе ў доме; Недаясі – і калёсы прадасі; Толькі й гора пану, што жывот баліць; Не давай, Божа, лячыцца ды судзіцца; Сыты лічыць зоры ў небе, а галодны мае думку аб хлебе; Грошы здароўя не дадуць.*

Такім чынам, уключэнне ў адукацыйны працэс парэмій можна праводзіць на розных этапах вывучэння дысцыпліны “Беларуская мова: прафесійная

лексіка” ў медыцынскіх ВНУ. Дадзеная практыка прадугледжвае распрацоўку розных тыпаў заданняў з мэтай вывучэння лексікі, граматыкі, а таксама практыкаванняў творчага характару. Праца з прыказкамі і прымаўкамі спрыяе паглыбленню ведаў пра свой народ, выхоўвае адказнасць, прывівае студэнтам працавітасць, сціпласць, сумленнасць, шчырасць, уменне быць удзячнымі сваёй зямлі, сваёй сям’і, будзіць імкненне да самаўдасканалення і самаразвіцця.

Літаратура

1. Фядосік, А. С. Прыказкі і прымаўкі ў дзвюх кнігах. Кніга 1 / рэд. А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – 560 с.
2. Кабашнікаў, К.П. Беларускі фальклор. Хрэстаматыя / К.П. Кабашнікаў. – Мінск : Вышэйшая школа, 1995. – 858с.